ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення
адукацыі Карэліцкага
райвыканкама, старшыня
арганізацыйнага камітэту
_____________
І.В.Асташэвіч
“ “ кастрычніка 2020 г.

**Заданні школьнага этапу рэспубліканскай алімпіяды**
**па беларускай мове і літаратуры 2020/2021 навучальны год**
**Комплексная работа**

**11 клас**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

**1. Устаўце прапушчаныя літары і падбярыце сінонімы да запазычаных слоў.**

..гаізм - …; фі..ска - …; ..н’екцыя - …; ун..кальны - …; туб..ркулёз - …; б..стс..лер - …; ав..ню - …; арб..траж - …; пл..б..сцыт - …; м..л..ярацыя - … .

**2. Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову. Ва ўсіх словах кожнага выразу пастаўце націск.**

| **У рускай мове** | **У беларускай мове** |
|---|---|
| 1.Увидеть своими глазами | |
| 2.Идти по полю | |
| 3.Дом в пять этажей | |
| 4.Согласно закону | |
| 5.Оставить после себя | |
| 6.Сказать по секрету | |
| 7.Ухаживать за девушкой | |
| 8.Создан по образцу | |

**3. Утварыце назоўнікі з указаным значэннем.**

1. Назва поля, дзе расла бульба – … . 2. Назва поля, дзе расла кукуруза – … .

3. Назва поля, дзе расло проса – … . 4. Назва поля, дзе рос лён – … . 5. Назва поля, дзе рос гарох – … . 6. У мінулым годзе – … . 7. Два гады назад – … . 8. Час, што папярэднічае вясне – ... . 9. Спецыяльнае памяшканне для захоўвання вазоў – … . 10. Падвальнае памяшканне – … .

**4. Прачытайце прыказку. Вызначце, які дзеяслоў у ёй мае граматычны амонім у форме прошлага часу адзіночнага ліку. Запішыце амаформы ў пачатковай форме, формах першай асобы адзіночнага і множнага ліку і другой асобы множнага ліку цяперашняга часу.**

І мыла, і шыла, і ткала, і прала – і ўсё языком *(Прыказка)*.

| Пачатковая форма | Форма першай асобы адзіночнага ліку | Форма першай асобы множнага ліку | Форма другой асобы адзіночнага ліку |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |

**5.Запішыце назоўнікі ў прапанаваных склонавых формах.**
Месны склон адз. лік: задуха, залатар(майстар), замок, запечак, засаўка, збан, звадка, звяга, мармур.

Творны склон адз.лік: засень, Наталля, Косця, косць, свякроў, жаль, рэч, мужчына, імя.

Родны склон мн. лік: сеялка , майка, дачка, кніжачка, журавель, жыціе, каромысел, бівень,апенька.

**6. Вызначце, як утварыліся прыдаткі да назваў свят і прысвяткаў беларускага народнага календара.**

| **Назва** | **Утваральная аснова** | **Спосаб словаўтварэння** |
|---|---|---|
| ***Узор:*** <br> ***24.04 – Анціп-ахоўнік*** | ***ахоўва(ць)+ нік ([] )*** | ***суфіксальны*** |
| 29.01– Пётра-паўкорма | | |
| 17.07– Андрэй Наліва | | |
| 23.06–Акуліна-грачышніца | | |
| 12.08– Іван-воін | | |
| 30.08– Міроны-ветрагоны | | |

**7. Запішыце колькасна-іменныя спалучэнні паводле прапанаванага ўзору. Узор: 1 пуд = 16,38 + кілаграм: 1 пуд роўны шаснаццаці цэлым трыццаці васьмі сотым кілаграма.**

| Лік | Колькасна-іменнве спалучэнне |
|---|---|
| 1палушка = ¼ + капейка | |
| 1рубель = 200 + грош | |
| 1залатоўка = 1,5 + грыўня | |
| 1алтын = 0,03 + рубель | |
| 1талер = 92,62 + капейка | |

**8. Запоўніце табліцу.**

| Герой (героі) | Назва твора | Жанр твора | Аўтар |
|---|---|---|---|
| Пячнік, зондэрфюрэр | | | |
| Пятрок і Сцепаніда | | | |
| Андрэй Лабановіч, Ядвіся | | | |
| Данілка, Зоська, Сымон, Лявон і Марыля Зяблікі | | | |

**9. Суаднясіце левы слупок табліцы з правым.**

| Назва структурна-кампазіцыйнага комплексу | Яго фармулёўка |
|---|---|
| 1.Трыпціх | А.Вершаваная жанравая форма.Характарызуецца сэнсавай незалежнасцю строф. |
| 2.Бурлеск | Б.Тры вершавныя творы на адну і тую ж тэму. |
| 3. Гратэск | В.Від камічнай, парадыйнай паэзіі, які асноўваецца на перавялічана камічным паказе розных жыццёвых з’яў |

| | |
|---|---|
| 4.Канцона | Г.Спосаб паказу жыццёвых з'яў або чалавека, пры<br>якім камічнае спалучаецца з фантастычным,пачварна- карыкатурным |
| 5.Стансы | Д.Куртуазная песня |

**10. Пад якімі нумарамі размешчаны героі з твораў Якуба Коласа?**

1)Міхал, дзядзька Антось, Ганна, Кастусь;
2)Серж, Насцечка Закрэўская, Мішка;
3)Сымон, дзед Курыла, Шлёма, пан Галыга;
4)Арончык, Булановіч, Абшарскі, Гарнова;
5) Лабановіч, Ядвіся, Саханюк, Турсевіч;
6)Гарлахвацкі, Туляга, Зёлкін, Левановіч, Чарнавус;
7)Данік Малец, пан Цаба, пані Мар'я, Мікола Кужалевіч;
8)Беларэцкі, Дубатоўк, Яноўская, Свеціловіч;
9)Шрэдэр, Лукашэвіч, Нявада, Ракуцька, Паліводскі, Акаловіч.